**УДК 94 |638| (476)**

# РАССЯЛЕННЕ НАСЕЛЬНІЦТВА Ў ВЯРХОЎЯХ Р. ВІЛІЯ І БЯРЭЗІНА (ДНЯПРОЎСКАЯ) У ЖАЛЕЗНЫМ ВЕКУ

***І.С. КАМІНСКІ***
***(Прадстаўлена: д-р гіст. навук, праф. Д.У. ДУК)***

*Вылучаюцца этапы рассялення насельніцтва ў вярхоўях р. Вілія і Бярэзіна (Дняпроўская) у жалезным веку. Адзначаюцца фактары рассялення насельніцтва жалезнага веку ў вярхоўях р. Вілія і Бярэзіна (Дняпроўская).*

Сістэма рассялення насельніцтва жалезнага веку залежыла ад фізіка-геаграфічных ўмоў рэгіёна [1, с. 13-14; 2, с. 11]. А.М. Мядзведзеў адзначае, што для пасяленняў жалезнага веку ўласціва прымеркаванне да пэўнага ландшафту і тыпу глебы [1, с. 14]. Гэта значыць, што пры рассяленні насельніцтва жалезнага веку існавала пэўная тэдэнцыя, абумоўленая шэрагам фактараў. Такім чынам, вылучэнне фактараў, якія абумоўлівалі тэндэнцыю пры рассяленні, дазваляе акрэсліць найбольш прыдатную для засялення мясцовасць. Адсюль даследаванне пасяленчаскай структуры насельніцтва жалезнага веку вярхоўяў р. Вілія і Бярэзіна (Дняпроўская) дазваляе прааналізаваць сістэму рассялення плямён у адзначаным рэгіёне.

Даследаванні працэсу рассялення насельніцтва жалезнага веку днепра-дзвінскай і штрыхаванай керамікі культур праводзіліся з улікам кліматычных змен галацэна на працягу трох адрэзкаў.Назіралася прымеркаванне пасяленняў да ландшафту і тыпу глебы засяляемага рэгіёна [1, с. 16; 2, с. 11; 3, с. 76, 77; 4].

Першы адрэзак (трэцяя фаза суббарэальнага перыяда) ахопліваў 1200-500 г. да н.э., другі (першая фаза субатлантычнага перыяда) – 500 г. да н.э. - 200 г. н.э., трэці (другая фаза субатлантычнага перыяда) – 200-1200 г. н.э. У перыяд першай фазы субатлантычнага перыяда (SA-1 – 500 г. да н.э. – 200 г. н.э.) павялічваецца колькасць ападкаў і зніжаецца тэмпература. Гэта выклікала агульны пад'ём вады на 4-5 м. У выніку сучасныя балоты ў той час уяўлялі сабой мелкаводныя азёры. Перыяд другой паловы І-га тысячагоддзя да н.э. – 2 ст. н.э. з'яўляецца фазай субатлантычнага заняпаду земляробства. З 200 г. н.э. клімат становіцца больш сухім. Адбываецца ўсыханне тарфяннікаў, змяншаецца сток рэк, панізаецца ўзровень азёраў [2; 3, с. 76, 77; 4].

Найбольшая шчыльнасць гарадзішчаў характэрна для ўзоркавых ландшафтаў [1, с. 16; 2, с. 11]. Аднак вярхорўі р. Вілія і Бярэзіна знаходзяцца пераважна ў нізінных ландшафтах. Ніжняе цячэнне р. Сэрвач, вярхоўі р. Вілія і Поня знаходзяцца ў Нарачана-вілейскай нізіне. На Свянцянскай градзе знаходзіцца вярхоўе р. Сэрвач. Вярхоўе р. Бярэзіна і ніжняе цячэнне р. Поня находзяцца ў Верхнебярэзінскай нізіне.

Для гаспадарчага выкарыстання больш прыдатнымі з'яўляюцца дзярнова-падзолістыя глебы на суглінках [1; 5]. Асноўнымі глебамі ў вярхоўях р. Вілія і Бярэзіна (Дняпроўская) з'яўляюцца дзярнова-падзолістыя глебы на супесках. Менш урадлівыя дзярнова-падзолістыя глебы на супесках сталі найбольш прыдатнымі для выкарыстання ў вярхоўях р. Вілія і Бярэзіна, так як у адзначаным рэгіёне знаходзіцца невялікая колькасць дзярнова-падзолістых глеб на суглінках.

Першыя гарадзішчы ў вярхоўях р. Вілія і Бярэзіна (Дняпроўская) вядомы з сярэдзіны-другой паловы І тыс. да н.э. У вярхоўі р. Вілія у гэты перыяд узнікае гарадзішча каля в. Гарадзішча (Бярозаўскі с/с). Паселішча знаходзіцца на левым забалочаным беразе р. Вілія на адлегласці 3-3,5 км на паўночны ўсход ад вытока ракі. Помнік, па выніках даследаванняў А.Р. Мітрафанава ў 1949 г. і 1971 г., аднесены да гарадзішча культуры штрыхаванай керамікі 3-2 ст. да н.э. [6, с. 250]. У вярхоўі р. Бярэзіна найбольш раннім з'яўляецца гарадзішча Бірулі. Помнік абследавалі ў 1938-1939 гг. А. Цэгак-Галубовіч і У. Галубовіч, у 1971 г. А.Р. Мітрафанаў [7, с. 108]. З 2011 г. даследаванні на гарадзішчы праводзіць З.А. Харытановіч. Значная колькасць касцяных вырабаў і ранняя формы посуду днепра-дзвінскай культуры далі падставы аднесці час засялення да сярэдзіны-другой паловы І тысячагоддзя да н.э. [8, с. 252, 258].

Утварэнне новых пасяленняў пачынаецца з мяжы эр. У канцы І-га тысячагоддзя да н.э. – першых стагоддзях н.э. ва ўсходняй Літве, цэнтральнай і паўночна-заходняй Беларусі адбываецца росквіт чорнай металургіі і ўкараненнем металічных вырабаў ва ўсіх сферах дзейнасці плямён днепра-дзвінскай і штрыхаванай керамікі культур [9, с. 335]. З мяжы эр на тэрыторыі Беларусі пачынаюць вырошчваць жыта, якое прыстасавана да нечарназёмных глеб [1]. У гэты час пачынаецца росквіт культуры штрыхаванай керамікі, а разам з ім і максімальнае пашырэнне тэрыторыі, калі носьбіты гэтай этнакультурнай супольнасці засялілі не толькі басейн Нёмана, але і вярхоўі левабярэжніх прытокаў Прыпяці (Лань, Случ, Бобр і інш.), верхняе і сярэдняе цячэнне Бярэзіны і яе прытокаў (Свіслач, Уша, Бобр і інш.), а таксама частку левабярэжных прытокаў Заходняй Дзвіны [10, с. 118].

На правым беразе р. Бярэзіна ўзнікае гарадзішча Беразіно. У 1991 г. А.У. Ільяцюк правяла археалагічныя раскопкі, па выніках якіх засяленне гарадзішча датавана к. І-га тыс. да н.э. – пач. І-га тыс.

н.э. [11, с. 102]. У 1ст. засяляюцца гарадзішчы Даўгінава, Малышкі, Равячкі [12, с. 142; 13, с. 242; 14, с. 58], Баравыя [15, с. 140], Баравічы [1, с. 78].

Наступная хваля рассялення пачынаецца з пачатку 3 ст. н.э і звязана са зменай клімату. Паніжэнне ўзроўню вады абумовіла засяленне больш нізінных ландшафтаў [3, с. 90]. Перыядам 3-4 стст. н.э. датуюцца гарадзішчы Асінавік [16, с. 244], Варганы [17, с. 145], Старае Запонне [18, с. 255]. Працягваюць існаваць гарадзішчы Баравыя, Беразіно, Бірулі, Даўгінава, Малышкі, Равячкі. Абарончыя збудаванні на гарадзішчах Баравічы [1, с. 78], Вітунічы [19, с. 167], Гарадзішча (Ваўкалацкі с/с) даюць падставу меркаваць аб іх заселенасці ў адзначаны перыяд.

З 3 ст. н.э. пачынаецца трансфармацыя пасяленчаскай структуры насельніцтва ў вярхоўях р. Вілія і Бярэзіна (Дняпроўская). У 3 ст. н.э. скончылася першая фаза субатлантычнага перыяду. Клімат стаў больш сухім, адбываецца ўсыханне тарфяннікаў, змяншаецца сток рэк, паніжаецца ўзровень азёраў. З-за паніжэння узроўня вады насельніцтва з 3 ст. н.э. пачынае асвойваць тэрыторый, якія вызваляліся ад вады. У 3-5 ст. н.э. назіраецца пераход насельніцтва на селішчы ў вярхоўях р. Вілія і Бярэзіна (Дняпроўская). Пераход насельніцтва на селішчы таксама звязваецца з перашкодамі для далейшага развіцця вытворчых сіл асобных сем'яхў. Дэмаграфічны рост патрабаваў асваення новых зямель, і насельніцва паступова пакідае эканамічна нявыгадныя патрыярхальныя гарадзішчы і пачынае сяліцца на адкрытых селішчах [2].

А.А. Егарэйчанка адзначае, што большасць гарадзішчаў Цэнтральнай і Паўночна-Заходняй Беларусі у канцы 2-сяр. 3 стст. н.э. перастае існаваць. А.А. Егарэйчанка ў якасці прычыны спынення жыцця на гарадзішчах дапускае змену клімату, як гэта звязваюць са знікненнем зарубінецкай культуры на Палессі [20, с. 112]. Наконт гарадзішчаў днепра-дзвінскай культуры В.І. Шадыра адзначае, што позьнія слаі гарадзішчаў датуюцца 2-3 стст. н.э. [21, с. 112]. Паводле А.М. Мядзведзева, змены, у тым ліку і пасяленчаскай структуры насельніцтва, даследчык звязвае з пачаткам трансфармацыі культуры штрыхаванай керамікі. У выніку кліматычных змен з 3 ст н.э. пачынаецца пераход на селішчы з захаваннем гарадзішча як цэнтра акругі [3, с. 91]. Паводле А.Р. Мітрафанава першапачаткова селішчы былі не звязаны з гарадзішчамі [22, с. 85].

Большасць гарадзішчаў вярхоўяў р. Вілія і Бярэзіна (Дняпроўская) функцыянавала ў 3-4 стст. н.э. Селішчы, якія адпавядаюць перыяду пераходу насельніцтва на селішчы вядомы каля гарадзішчаў Бірулі, Варганы і Равячкі (3 з 12) [7; 13; 17]. Неабходна звярнуць увагу на лакалізацыю селішчаў адносна гарадзішчаў. Селішча Равячкі (5-6 ст. н.э.) знаходзіцца на адлегласці 1 км на паўднёвы-захад ад вёскі, на ўзвышшы правага берага р. Сэрвач. Гарадзішча Равячкі (1-4 ст. н.э.) размяшчаецца за 0,5 км на паўднёвы-ўсход ад вёскі, сярод поплаву р. Сэрвач [13, с. 242]. На селішчы Равячкі ў выніку археалагічных раскопак былі выяўлены рэшткі чатырох паўзямлянак. У чацвёртай, у запаўненні і ў печцы-каменцы былі знойдзены развал штрыхаванага рабрыстага гаршка і шэраг фрагментаў рабрыстых гаршкоў [22, с. 85-87]. Да гарадзішча Бірулі прымыкае забалочаная пойма воз. Медзазол. Селішча-3 знаходзіцца на адлегласці 1,4 км на поўнач ад гарадзішча, на заходнім беразе воз. Медзазол. Гарадзішча Бірулі дзейнічала ў гэты час [7, с. 109; 25]. Такім чынам, знаходкі посуду культуры штрыхаванай керамікі на селішчы Равячкі і існаванне селішча-3 каля Бірулі ў 3 ст. н.э. разам з гарадзішчам даюць падставу меркаваць аб тым, што насельніцтва гарадзішчаў мела дачыненне да ўтварэнне селішчаў. З паніжэннем узроўню вады з 3 ст. н.э. насельніцтва гарадзішчаў, існаванне якога залежыла ад значных водных рэсурсаў, пераходзіць на селішчы, якія знаходзіліся непасрэдна на берагах рэк (Равячкі) і азёр (Бірулі).

У такім выпадку, выклікае цікаўнасць лакалізацыя селішчаў каля гарадзішчаў не звязаных з буйнымі воднымі рэсурсамі і адсутнасць селішчаў на берагах р. Сэрвач і Бярэзіна, якія былі звязаныя з насельніцтвам гарадзішчаў Беразіно, Малышкі і інш. і маглі ўзнікаць у перыяд 3-5 стст. н.э. Верагодна, гэта можна растлумачыць недастатковай даследаванасцю рэгіёна, у прыватнасці цяжкасцю выяўлення селішчаў, якія не знаходзіліся ў сістэме з гарадзішчамі. Так, селішча-3 каля в. Бірулі выяўвіў П.М. Кенька ў 2006 г. дзякуючы выпадковай знаходцы шкляной зялёнай бусіны [23, с. 235]. Селішчы каля гарадзішчаў не звязаных з буйнымі воднымі рэсурсамі маглі ўзнікаць адразу каля гарадзішчаў. Так, селішча Варганы знаходзіцца каля паўднёвай падэшвы гарадзішча (3-4 стст. н.э.) і датуецца 5-7 стст. н.э. [17, с. 145]

Такім чынам, у рассяленні насельніцтва ў вярхоўях р. Вілія і Бярэзіна (Дняпроўская) у жалезным веку вылучаецца тры этапы. Першы этап пачынаецца з сярэдзіны I тыс. да н.э. і цягнуўся да мяжы эр. Узнікаюць першыя ўмацаваныя пасяленні ў вярхоўях р. Вілія і Бярэзіна (Бірулі, Гарадзішча (Бярозаўскі с/с)). Другі этап ахоплівае перыяд 1-2 стст. н.э. З'яўляюцца гарадзішчы ў ніжнім цячэнні цячэння р. Сэрвач (Баравое, Баравічы, Даўгінава, Малышкі, Равячкі), працягваецца рассяленне на правым беразе р. Бярэзіны (Беразіно). Трэці этап рассялення ахоплівае 3-4 ст. н.э. Адбываецца рассялення ў вярхоўях р. Сэрвач (Варганы, Гарадзішча (Бярозаўскі с/с), Латыголь) і Поня (Асінавік, Вітунічы, Старое Запонне). У 3-4 ст. н.э. працягваюць функцыянаваць гарадзішчы створаныя ў 1 ст. н.э. і гарадзішча Бірулі. Гарадзішча (Бярозаўскі с/с) перастае функцыянаваць у 2 ст. да н.э. З 3 ст. н.э. пачынаецца пераход на селічшы (Бірулі (3-10 ст. н.э.), Варганы (5-7 ст. н.э.), Равячкі (5-6 ст. н.э.)). Такім чынам, з 1 ст. н.э. у вярхоўях р. Вілія і Бярэзіна (Дняпроўская) назіраецца актывізацыя працэсу рассялення насельніцтва. У перыяд 1-5 ст. н.э. узнікае 12 гарадзішчаў і 3 селішчы.

Актывізацыя працэсу рассялення з 1 ст. н.э. у вярхоўях р. Вілія і Бярэзіна (Дняпроўская) была выклікана росквітам чорнай металургіі і ўкараненнем металічных вырабаў ва ўсіх сферах дзейнасці плямён днепра-дзвінскай і штрыхаванай керамікі культур. З мяжы эр на тэрыторыі Беларусі пачынаюць вырошчваць жыта, якое прыстасавана да нечарназёмных глеб. Выкарыстанне жалезных прылад працы (сякеры, сярпы і інш.) пры падсечна-агнявым земляробстве дазваляла асвойваць большую плошчу тэрыторый занятых лясамі. З'яўленне жалезных прылад працы і вырошчванне жыта абумовіла развіццё гаспадаркі і адпаведна павелічэнне колькасці пасяленняў, у тым ліку на неўрадлівых глебах. Такім чынам, вярхоўі р. Вілія і Бярэзіна (Дняпроўская) з пераважна неўрадлівымі глебамі актыўна пачынаюць засяляцца з 1 ст. н.э.

Гарадзішчы па ніжнім цячэнні р. Сэрвач (Баравічы, Баравыя, Малышкі, Равячкі) знаходзяцца на берагах р. Сэрвач. Засяленне згаданых гарадзішчаў датуюецца 1 ст. н.э. Магчыма, у гаспадарцы насельніцтва адзначаных гарадзішчаў з-за вялікай шчыльнасці ў параўнанні з іншымі групамі і абмежаванай колькасці ўрадлівых глебаў значная роля належыла промыслам, пры панаванні вытворчых форм гаспадаркі. На аснове археалагічнага матэрыялу можна меркаваць, што для насельніцтва гарадзішчаў, існаванне якіх залежыла ад значных водных рэсурсаў (Бярэзіна (Бірулі), Сэрвач (Малышкі)) вялікую ролю адыгрывала рыбалоўства. На гарадзішчы Малышкі была сабрана вялікая калекцыя гліняных грузікаў [1, с. 176] і гліняных грузіл [1, с. 178-180]. Грузікі, два рыбалоўныя кручкі былі знойдзены на гарадзішчы Бірулі [8, с. 255, 256]. Таксама на гарадзішчы Бірулі была знойдзена прылада зробленая са сценкі рабрыны ў выглядзе невялікай рагацінкі, край якой загладжаны. Яе маглі выкарыстоўваць для пляцення сетак [8, с. 256]. Значную ролю адыгрывала і паляванне. На гарадзішчы Малышкі каля 43% касцей належыць дзікай жывёле [20, с. 99]. Аднак, неабходна адзначыць, што адносна вялікі паказчык у параўнанні з іншымі гарадзішчамі днепра-дзвінскай і штрыхаванай керамікі культур (20-40 %) можа быць выкліканы малой колькасцю астэалагічнага матэрыялу [20, с. 99].

Пацяпленне і вызваленне раней затопленых тэрыторый ад вады ў 3 ст. н.э. выклікала новую хвалю рассялення ў вярхоўях р. Вілія і Бярэзіна (Дняпроўская). У 3 ст. н.э. актывізавалася рассяленне насельніцтва, асновай гаспадаркі якога было земляробства. Знаходжанне гарадзішчаў на адлегласці адзін ад аднаго было абумоўлена перамяшчэннем земляробства на аддаленыя тэрыторыі ад пасялення (да 10 км). Для нармальнага функцыянавання пасяленняў жалезнага веку, пры панаванні падсечна-агнявога земляробства, адлегласць паміж імі павінна складаць 10 км [1, с. 14]. Гэтаму паказчыку адпавядаюць гарадзішчы Беразіно, Бірулі, Варганы, Гарадзішча (Ваўкалацкі с/с), Латыголь, Даўгінава і Малышкі. Паказальна, што гарадзішчы Варганы, Гарадзішча (Ваўкалацкі с/с), Латыголь і гарадзішча Даўгінава не звязаны з буйнымі воднымі рэсурсамі. Верагодна, гэта сведчыць аб пануючым значэнні земляробства ў гаспадарцы адзначаных гарадзішчаў. Для першай паловы I тыс. н.э. характэрна скарачэнне ролі прысвайваючых форм гаспадаркі, а сярод вытворчых форм дамінуючае значэнне атрымлівае земляробства [20, с. 97]. Знаходжанне гарадзішчаў на адлегласці адзін ад аднаго было абумоўлена перамяшчэннем земляробства на аддаленыя тэрыторыі ад пасялення [21, с. 94]. Верагодна гэтым тлумачыцца знаходжанне гарадзішчаў, асабліва позніх Асінавік, Варганы, Старое Запонне, паводдаль ад значных водных артэрый.

Археалагічны матэрыял з гарадзішчаў Беразіно, Бірулі, Малышкі сведчыць аб тым, што насельніцтва займалася вытворчымі формамі гаспадаркі. На заняцце насельніцтвам жывёлагадоўляй указвае колькасць костак дамашняй жывёлы (57,4 %) на гарадзішчы Малышкі [20, с. 99]. Косці мелкай рагатай жывёлы складае 30 % і саступае толькі буйной рагатай жывёле [20, с. 101]. Пры пагаршэнні клімату мелкая рагатая жывёла даваляла пераджыць цяжкія ўмовы [1, с. 51]. Вынікі аналізу астэалагічнага матэрыялу з іншых гарадзішчаў вярхоўяў р. Вілія і Бярэзіна (Дняпроўская) невядомы.

Знаходкі каменных [1, с. 137] і жаленых сякер [1, с. 154] жалезнага сярпа [1, с. 157], чатырох верхніх камянёў і аднаго ніжняга камяня ад зерняцёрак на гарадзішчы Малышкі [22, с. 45] сведчыць аб заняцці насельніцтва земляробствам. Серп і два фрагменты сярпоў было знойдзена на гарадзішчы Бірулі. Цэлы серп датуецца мяжой эр [8, с. 255]. Жалезны серп таксама быў знойдзены на гарадзішчы Беразіно [11, с. 102].

Такім чынам, рассяленнне насельніцтва жаленага веку басейна вярхоўяў р. Вілія і Бярэзіна (Дняпроўская) было абумоўлена такімі фактарамі як нізінны характар ландшафта, адсутнасць вялікай колькасці найбольш урадлівых дзярнова-падзолістых глеб на суглінках і залежнасць месцазнаходжання гарадзішчаў ад гаспадарчых рэсурсаў.

З нізінным характарам ландшафта звязана існаванне значнай забалочанай тэрыторыі, што перашкаджала рассяленню. Так, гарадзішчы ў вярхоўях р. Бярэзіна, Поня і Сэрвач адасоблены ад гарадзішчаў па ніжнім цячэнні р. Сэрвач балотнымі масівамі, якія прылягаюць да р. Вілія, Сэрвач і Поня.

Другі фактар звязаны з уласцівасцямі глебы. Найбольш урадлівымі глебамі з'яўляюцца дзярнова-падзолістыя глебы на суглінках. У вярхоўях р. Вілія і Бярэзіна (Дняпроўская) менш урадлівыя дзярнова-падзолістыя глебы на супесках сталі найбольш прыдатнымі для выкарыстання так як у адзначаным рэгіёне знаходзіцца невялікая колькасць дзярнова-падзолістых глеб на суглінках. Урадлівасць глебы

вызначала тэрмін функцыянавання пасялення. Гарадзішча (Бярозаўскі с/с), створанае ў 3 ст. да н.э. на дзярнова-падзолістых забалочаных глебах на супесках і пясках, якія менш урадлівыя, чым дзярнова-падзолістыя на супесках, спыняе існаванне ў 2 ст. да н.э. У сваю чаргу працягвае выкарыстоўвацца да канца I тыс. н.э. гарадзішча Бірулі, створанае на дзярнова-падзолістых глебах на супесках у сярэдзіне I тыс. да н.э..

Трэцім фактарам рассяленннне насельніцтва жаленага веку басейна вярхоўяў р. Вілія і Бярэзіна (Дняпроўская) з'яўляецца залежнасць месцазнаходжання пасяленняў ад гаспадарчых рэсурсаў. Гарадзішчы створаныя ў 1 ст н.э. залежылі ад рэсурсаў буйных рэк і азёр. Гарадзішчы Баравічы, Баравое, Малышкі знаходзяцца на беразе р. Сэрвач, гарадзішча Беразіно знаходзіцца на беразе р. Бярэзіна. Гарадзішча Равячкі знаходзіцца сярод поплаву р. Сэрвач. Да гарадзішчаў Бірулі, Даўгінава зараз прымыкаюць балоты, якія ў жалезным веку былі мелкаводнымі азёрамі. На аснове археалагічнага матэрыялу (рыбалоўныя кручкі, грузікі, вялікая колькасць касцей дзікай жывёлы і інш.) можна меркаваць, што для насельніцтва гарадзішчаў, існаванне якіх залежыла ад рэсурсаў вялікіх рэк і азёр значную ролю адыгрывалі промыслы. Перыяд другой паловы I-га тысячагоддзя да н.э. – 2 ст. н.э. з'яўляецца фазай субатлантычнага заняпаду земляробства. Глебы ў нізінных вярхоўях р. Вілія і Бярэзіны (Дняпроўская) у адзначаны перыяд былі затоплена і пераўвільготнены. Пераўвільготненасць глебы перашкаджала актыўнаму заняццю земляробствам і абумовіла значную ролю промыслаў у гаспадарцы адзначаных гарадзішчаў. Утварэнне селішчаў Бірулі (3-10 ст. н.э.) і Равячкі (5-6 ст. н.э.) на адлегласці ад гарадзішчаў, непасрэдна на берагах рэк і азёр, ад рэсурсаў якіх яны былі залежныя раней, верагодна, сведчыць аб захаванні значнай ролі промыслаў у гаспадарцы насельніцтва адзначаных пасяленняў пры пераходзе на селішчы. Адсутнасць аналізу астэалагічнага матэрыялу з селішчаў вярхоўяў р. Вілія і Бярэзіна (Дняпроўская) не дазваляе нам дакладна казаць аб ролі жывёлагадоўлі і паляўніцтва ў гаспадарцы насельніцтва адзначанага рэгіёна ў перыяд пераходу насельніцтва на селішчы (3-5 ст. н.э.).

Гарадзішчы Асінавік, Варганы, Вітунічы, Гарадзішча (Ваўкалацкі с/с), Латыголь, Старое Запонне знаходзяцца паводдаль ад буйных рэк і азёр. Верагодна, асновай гаспадаркі насельніцтва адзначаных гарадзішчаў з'яўлялася земляробства. Заняццем падсечна-агнявым земляробствам тлумачыцца знаходжанне гарадзішчаў Асінавік, Варганы, Гарадзішча (Ваўкалацкі с/с), Латыголь, Старое Запонне паводдаль ад значных рэк и азёр. Для функцыянавання згаданых гарадзішчаў вырашальную ролю мела наяўнасць вялікай лясной тэрыторыі (радыусам да 10 км), а не буйныя рэкі і азёры. Разам з гэтым, нельга казаць аб адсутнасці сувязі пасяленняў з воднымі рэсурсамі. Гарадзішчы Варганы, Гарадзішча (Ваўкалацкі с/с), Латыголь звязаны з воз. Сэрвач і невялікімі рэкамі, што ў яго ўпадаюць. Гарадзішчы Асінавік, Вітунічы, Старое Запонне знаходзяцца каля невялікіх прытокаў р. Поня. Утварэнне селішча Варганы (5-7 ст. н.э.) адразу каля гарадзішча Варганы (3-4 ст. н.э.), якое не было звязана з буйнымі воднымі рэсурсамі, верагодна, сведчыць, што асновай гаспадаркі насельніцтва згаданага пасялення працягвала заставацца земляробства.

## ЛІТАРАТУРА


1. Медведев, А.М. Белорускoе Понеманье в раннем железном веке (1 тысячелетие до н.э. – 5 в. н.э.) / А.М. Медведев. – Минск, 1996. – 200 с. : ил.
2. Шадыра, В.І. Беларускае Падзвінне (І тысячагддзе н.э.) / В.І. Шадыра. – Мінск : Ін-т гісторыі НАН Беларусі, 2006. – 150 с. ; іл.
3. Медведев, А.М. Поселения культуры штрихованной керамики (некоторые экономические и социальные аспекты в расселении) / А.М. Медведев // Гістар.-археалаг. зб. – 1994. – № 3. – С. 74 – 102.
4. Микляев, А.М. Каменный – железный век в междуречье Западной Двины и Ловати : автореф. дис. ... д-ра ист. наук / А.М. Микляев. – СПб. : РАН, Ин-т истории материальной культуры. – 1992. – 69 с.
5. Марчик, Т.П. Факторы почвообразования и почвы Республики Беларусь / Т.П. Марчик, А.Л. Ефремов // Почвоведение с основами ратениеводства [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://ebooks.grsu.by/pochva_s_osn_rast/glava-12-faktory-pochvoobrazovaniya-i-pochvy-respubliki-belarus.htm, свободный. – Дата доступа: 30.04.2015.
6. Мітрафанаў, А.Р. Гарадзішча / А.Р. Мітрафанаў // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэд. кал. : С.В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Сав. Энцыкл., 1985. – С. 249-250.
7. Кенька, П.М. Бірулі / П.М. Кенька, А.В. Вайцяховіч // Археалогія Беларусі: энцыклапедыя. У 2 т. / рэдкал. : Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Энцыкл. імя П. Броўкі, 2009. – Т. 1. А-К. – С. 108-109.
8. Харытановіч, З.А. Археалагічныя даследаванні на гарадзішчы Бірулі ў 2012 годзе / З.А. Харытановіч // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – 2014. – Вып. 25. – С. 252 – 258.
9. Егарэйчанка, А.А. Жалезны век / А.А. Егарэйчанка // Археалогія Беларусі: энцыклапедыя. У 2 т. / рэдкал.: Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Энцыкл. імя П. Броўкі, 2009. – Т. 1. А-К. – С. 334-335.
10. Археалогія Беларусі: у 4 т. – Мінск : Беларус. навука, 1997 – 2001. – Т. 2. Жалезны век і ранняе сярэднявечча / А.А. Егарэйчанка [і інш.]. – 1999. – 502 с. ; іл.

11. Ільюцік, А.У. Беразіно / А.У. Ільюцік // Археалогія Беларусі: энцыклапедыя. У 2 т. / рэдкал.: Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Энцыкл. імя П. Броўкі, 2009. – Т. 1. А-К. – С. 102.
12. Мітрафанаў, А.Р. Даўгінава / А.Р.Мітрафанаў // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Мінская вобласць / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэд. кал.: С.В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Сав. Энцыкл., 1985. – С. 142.
13. Мітрафанаў, А.Р. Равячкі / А.Р. Мітрафанаў // Археалогія Беларусі : энцыкл. У 2 т. / рэдкал. : Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. – Т. 2. Л-Я. – С. 242.
14. Шадыра, В.І. Малышкі / В.І. Шадыра // Археалогія Беларусі: энцыклапедыя. У 2 т. / рэдкал. : Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. – Т. 2. Л-Я. – С. 58.
15. Звяруга, Я.Г. Баравыя / Я.Г. Звяруга // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Мінская вобласць / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэд. кал. : С.В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Сав. Энцыкл., 1985. – С. 140.
16. Мітрафанаў, А.Р. Асінавік / А.Р. Мітрафанаў // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэд. кал. : С.В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Сав. Энцыкл., 1985. – С. 244.
17. Штыхаў, Г.В. Варганы / Г.В. Штыхаў // Археалогія Беларусі : энцыкл. У 2 т. / рэдкал. : Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Энцыкл. імя П. Броўкі, 2009. – Т. 1. А-К. – С. 145.
18. Мітрафанаў, А.Р. Старое Запонне / А.Р. Мітрафанаў // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэд. кал. : С.В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Сав. Энцыкл., 1985. – С. 255-256.
19. Кенька, П.М. Вітунічы / П.М. Кенька, А.В. Вайцяховіч // Археалогія Беларусі : энцыкл. У 2 т. / рэдкал. : Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Энцыкл. імя П. Броўкі, 2009. – Т. 1. А-К. – С. 167-168.
20. Егорейченко, А.А. Культуры штрихованной керамики / А.А. Егорейченко. – Минск : БГУ, 2006. – 207 с. : ил.
21. Шадыро, В.И. Ранний железный век северной Белоруссии / В.И. Шадыро ; под ред. А.Г. Митрофанова. – Минск : Наука и техника, 1985. – 126 с. : ил.
22. Митрофанов, А.Г. Железный век средней Белоруссии (VII-VI вв. до н.э. – VIII в. н.э.) / А.Г. Митрофанов. – Минск : Наука и техника, 1978. – 160 с. : ил.
23. Кенько, П.М. Разведки на юге Витебской области / П.М. Кенько // Гістар.-археалаг. зб. – 2007. – Вып. 23. – С. 233 – 235.

**УДК 94(476.5)”11”**

## УДЗЕЛ ПОЛАЦКАГА КНЯСТВА Ў МІЖУСОБНАЙ БАРАЦЬБЕ ПАЎДНЁВАРУСКІХ КНЯЗЁЎ У 60-80-ЫЯ ГАДЫ XII СТАГОДДЗЯ.

***М.П. КРУПСКІ***
***(Прадстаўлена: д-р гіст. навук, дац. Д.В. ДУК)***

На працягу другой паловы XII ст. унутрыпалітычная сітуацыя на землях Паўднёвай Русі была складанай. У 1162 г. на полацкім стале зацвярдзіўся Усяслаў Васількавіч, які быў запрошаны полацкім веча з Віцебска. Полацкая зямля перажывала не самыя спакойныя часы, а таму была вымушаная шукаць саюзнікаў. Усяслаў Васількавіч знаходзіўся ў сваяцкіх адносінах са смаленскім князем Давыдам Расціславічам. Менавіта гэты накірунак быў выбраны для аб'яднання сіл у барацьбе з суседзямі. За дапамогу ў ваеннай справе смаленскі князь запатрабаваў Віцебск. Пад 1165 г. у летапісу знаходзім: «Давид Ростиславич седее витебьски» [1]. Аднак варта адзначыць, што Віцебск перадаваўся Смаленску ў часовае валоданне. Што мы і ўбачым у далейшай гісторыі ўзаемаадносін Полацка і Смаленска. Менавіта ў гэтым Л. В. Аляксееў бачыў пачатак распаду Полацкага княства [2, с. 275], а І. Ц. Бяляеў [3] і В.Я. Данілевіч [4] увогулі лічылі поўную страту незалежнасці Полацкім княствам. В. Л. Насевіч не выключае часовай залежнасці Полацка ад Смаленска. Спасылаючыся на тое, што гандлёвае пагадненне з Рыгай 1229 г. Мсціслаў Давыдавіч, тагачасны вялікі князь Смаленска, палпісваў ад імя Смаленска, Полацка і Віцебска [5, с. 15]. Варта адзначыць дальнавіднасць полацкага веча. Няма падстаў сумнявацца, што вялікі князь прымаў рашэнне аб перадачы ў часовае валоданне Віцебскам са згоды веча. Гэта была тонкая дэпламатыя тых часоў, якая на той момант апраўдала сябе поўнасцю.

У 1167 г. Валадар Менскі прадпрымае паход на Полацк і захватывае яго [2, с. 278; 6, с. 225; 7, с. 118]. Усяслаў Васількавіч збягае ў Віцебск, свой княжацкі надзел, які, нагадаю, займаў да прыхода на полацкі стол. Валадар рушыцца на Віцебск, але паварочвае войскі, атрымаўшы ложныя слухі аб надыходзе войск Рамана Смаленскага, саюзніка Усяслава Васількавіча. У сваю чаргу Усяслаў змог вярнуцца ў Полацк на княжанне.

Полацкія падзеі 1167 г. аналізуе М. І. Ермаловіч. Які ліча паражэнне Менска ў барацьбе за гегемонію ў Полацкай зямлі невыпадковым. Калі ў 1162 г. з дапамогай літвы можна было на месцы ў абароне атрымаць перамогу, то яе недастаткова было пры наступленні ўдалечыні. Нават каб не было